**Гавейновіч, В.** За баявыя заслугі / В. Гавейновіч // Полацкі веснік. — 2003. — 23 мая. — С. 2.

# ЗА БАЯВЫЯ ЗАСЛУГІ



**1989 год. Кушка. Маёр Аляксандр Крупскі служыць прапагандыстам палка. Яшчэ пакуль ідзе вайна ў Афганістане, і іх дывізія рыхтуе асабовы састаў для ўдзелу ў баявых дзеяннях. Менавіта праз Тэрмез і Кушку ў тым жа 1989 годзе выходзілі нашы войскі з Афганістана. Выходзілі з вайны.**

Дывізія, у якой служыў маёр Крупскі – адна з лепшых у Сярэднеазіяцкай ваеннай акрузе. За дасягненні ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы маёр Аляксандр Мікалаевіч Крупскі быў прадстаўлены да ўзнагароды медалём «За баявыя заслугі». Указ падпісаны 25 ліпеня 1989 года.

Прайшло 14 гадоў. Былыя рэспублікі СССР сталі самастойнымі дзяржавамі. Выраслі граніцы. Ветэраны Афганістана жылі ў сваіх краінах і не ведалі, што іх шукаюць узнагароды.

2003 год. Багатырская сярэдняя школа. Актавая зала перапоўнена. Дырэктар школы Аляксандр Крупскі ўваходзіць у залу ў форме падпалкоўніка. Побач саветнік пасла Расійскай Федэрацыі Канстанцін Кузняцоў, намеснік старшыні райвыканкама Віктар Машчыцкі, выконваючы абавязкі ваеннага камісара г. Полацка Генадзь Нечаяў.



«Па даручэнні Уладзіміра Пуціна ваш дырэктар школы ўзнагароджваецца медалём «За баявыя заслугі», – гаворыць саветнік і пад апладысменты ўручае Аляксандру Крупскаму медаль. «Наш пасол, – працягвае ён, – ужо ўзнагародзіў 58 чалавек – воінаў, ветэранаў Афганістана. Засталося некалькі, сярод іх і ваш дырэктар».

Пра пераемнасць пакаленняў у сваім выступленні гаварыў Віктар Машчыцкі, аб выхаванні на добрых прыкладах і каштоўнасці баявых узнагарод расказаў Генадзь Нечаяў.

Са словамі ўдзячнасці звярнуўся да саветніка, калектыву школы яе дырэктар, які ўжо дзесяць год вядзе школьны карабель па дарогах ведаў. «Як і ў час ваеннай службы, так і цяпер, я абяцаю вам, што буду працаваць гэтак жа сумленна і шчыра», – дадаў ён.

Былі яшчэ віншаванні ад калектыву, уручалі кветкі віноўніку ўрачыстасці і госцю – саветніку пасла.

**В. Гавейновіч**